УДК 75.041.5(476)

# Тыпалогія партрэтных вобразаў у жывапісе Мікалая Апіока. Да 90-годдзя з дня нараджэння мастака

**Цыбульскі М.Л.**
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск*

*Артыкул прысвечаны асноўным этапам жыцця і творчасці заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кавалера ордэна Францыска Скарыны, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне", арганізатара і шматгадовага кіраўніка студыі ваенных мастакоў, сябра Беларускага саюза мастакоў Мікалая Апанасавіча Апіока. У сваёй творчасці майстар аддае перавагу розным жанрам станковага жывапісу, але адно з цэнтральных месцаў у ёй належыць партрэту, які паўстае не проста як выява чалавека, але як дакумент эпохі, як імкненне дакрануцца да значных гістарычных падзей, сведкамі якіх сталі яго героі. Тыпалогія партрэта ў палотнах М. Апіока вельмі шырокая: парадныя і камерныя партрэты, касцюміраваныя партрэты-карціны і партрэты-тыпы, гістарычныя, лірычныя і інтымныя партрэты. Мастак стварае як індывідуальныя, так і групавыя партрэты, заўжды псіхалагічныя і эмацыянальна выразныя па сваёй сутнасці. Выбар таго ці іншага тыпу партрэта для мастака быў заўсёды адметным і непаўторным шляхам спасціжэння сваёй мадэлі, спосабам адлюстраваць унутраны свет асобы.*

*У тэматычных кампазіцыях мастак таксама стварае даволі выразныя персаніфікаваныя вобразы і падае іх у канкрэтызаваным гістарычным ці сюжэтным кантэксце. У артыкуле разглядаюцца асноўныя этапы жыцця і творчасці М. Апіока, асаблівая ўвага нададзена віцебскаму перыяду яго жыцця.*

***Ключавыя словы:*** *Мікалай Апіок, сучасны беларускі жывапіс, партрэт, тэматычная кампазіцыя, касцюміраваны партрэт, парадны партрэт, камерны партрэт, аўтапартрэт.*

*(Искусство и культура. – 2026. – № 1(61). – С. 5–11)*

# Typology of Portrait Images in the Painting of Nikolai Apiok. To the 90th Anniversary of the Artist's Birth

**Tsybulsky M.L.**
*Education Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk*

*The article is dedicated to the main stages of the life and work of the Honored Artist of the Republic of Belarus, Knight of the Order of Francisk Skaryna, laureate of the special prize of the President of the Republic of Belarus "For Spiritual Revival", organizer and long-time head of the studio of military artists, member of the Belarusian Union of Artists Nikolai Afanasyevich Apiok. In his work, the artist prefers various genres of easel painting, but one of the central places in it belongs to the portrait, which appears not simply as an image of a person, but as a document of the era, as an aspiration to touch upon significant historical events witnessed by his heroes. The typology of the portrait in the canvases of M. Apiok is very wide: ceremonial and chamber portraits, costumed portrait paintings and portraits-types, historical, lyrical and intimate portraits. The artist creates both individual and group portraits, always psychological and emotionally*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

*expressive in nature. The choice of one or another type of portrait for the artist has always been a distinctive and unique way of understanding his model, a way to reflect the inner world of a person.*

*In thematic compositions, the artist also creates quite expressive personified images and presents them in a specific historical or plot context. The article examines the main stages of M. Apiok's life and work, with special attention paid to the Vitebsk period of his life.*

***Key words:*** *Nikolai Apiok, modern Belarusian painting, portrait, thematic composition, costumed portrait, ceremonial portrait, chamber portrait, self-portrait.*

*(Art and Cultur. – 2026. – № 1(61). – P. 5–11)*

У сваёй творчасці Мікалай Апіок разнапланавы — ён паспяхова працуе ў розных жанрах жывапісу — тэматычнай карціне, партрэце, пейзажы, нацюрморце. З'яўляючыся самааданым прыхільнікам традыцый рэалістычнай школы жывапісу, мастак у большасці сваіх палотнаў імкнецца да творчага пераасэнсавання праблемы ўзаемадачыненняў асобы і часу, ролі канкрэтнага чалавека ў гісторыі краіны. "Творчасць Апіока — гэта своеасаблівы зрэз часу. Падзеі, убачаныя вачыма мастака, творча перапрацаваныя і ўвасобленыя ў жывапісных вобразах" [1, с. 6]. Яго жывапіс "прасякнуты пазітыўным светапоглядам і любоўю да чалавека, адлюстроўвае час і неадназначнасць нашага жыцця, і дапытлівасць неабыякавай творчай асобы, і душэўную гармонію мастака" [2, с. 19].

Героямі партрэтаў і тэматычных кампазіцый М. Апіока з'яўляюцца славутыя асобы беларускай гісторыі і нашы знакамітыя сучаснікі — выдатныя дзеячы культуры і мастацтва, спартсмены, касманаўты, военачальнікі, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Імёны многіх з іх назаўжды ўпісаны ў летапіс Беларусі.

Мэта артыкула — выявіць і прааналізаваць асноўныя тыпы партрэтных вобразаў у жывапісных кампазіцыях вядомага беларускага мастака Мікалая Апіока ў кантэксце яго жыцця і творчасці.

**Ля вытокаў. Віцебскі перыяд.** Мікалай Апіок нарадзіўся 20 лістапада 1935 года ў вёсцы Макараўка Дубровенскага раёна. Дзяцінства мастака прыпала на перыяд Вялікай Айчыннай вайны і першыя гады аднаўлення краіны. Вучыўся ён спачатку ў пачатковай школе ў вёсцы Якубава, а з 5 класа — у Пірагоўскай сямігадовай школе. "Хадзілі ў школу за 3 кіламетры праз маленькі бярозавы гай. Ішлі гуртом і чыталі «Маладую гвардыю». Вось дзе выхоўваўся патрыятызм"[1].

Мара вучыцца на мастака была ў Мікалая Апіока з дзяцінства. Але тады ён нічога не ведаў аб асаблівасцях гэтай прафесіі, ды і ўвогуле "нічога не разумеў у маляванні"[2], паколькі ў пасляваенны час у школе яго не выкладалі [3]. "У нашай хаце насупраць печы, дзе мы спалі, на сцяне былі прымацаваны дзве рэпрадукцыі з карцін І. Рэпіна «Мужык з дурным вокам» і А. Пластава «Сенакос». Гэтыя каляровыя ілюстрацыі з часопіса «Огонёк» кранялі маю душу, і абуджалі фантазію, — узгадвае М. Апіок. — Мне так хацелася навучыцца маляваць, каб стварыць партрэты сваіх гераічных аднавяскоўцаў, людзей, што перажылі вайну, і адлюстраваць наш прыгожы луг, з кветкамі і разнатраўем, на які нам, дзецям, было забаронена хадзіць, бо з яго рабілі трохразовы ўкос травы, каб карміць скаціну"[3].

У той жа час, калі Мікалай Апіок пачаў спрабаваць нешта маляваць, яму давялося дакрануцца яшчэ да аднаго віда мастацкай дзейнасці. "Недзе ў 5 класе, па запыце нашага брыгадзіра я пачаў пісаць лозунгі і плакаты, то да выбараў, то да чарговай гадавіны рэвалюцыі... Гэта былі мае першыя крокі ў мастацтве афармленчым. Спачатку я алоўкам на адваротным баку шпалер намячаў літары. Маці варыла для мяне цёмна-чырвоныя буракі, з якіх я рабіў густую фіялетавую фарбу. Замест пэндзля выкарыстоўваў палачку з намatанай на ёй анучкай. Мае шрыфтавыя працы вывешвалі звычайна на будынку праўлення нашага калгаса"[4].

Жаданне М. Апіока ў будучым стаць мастаком знайшло падтрымку сярод яго аднакласнікаў. "З сябрамі мы нават напісалі ліст К.Я. Варашылаву: паколькі мы хочам вучыцца на мастакоў, просім даслаць нам паперу і фарбы. Далі праверыць нашай настаўніцы, потым выправілі памылкі, перапісалі начыста і ўкінулі ліст у паштовы вагон цягніка Мінск–Масква, які штодзень праходзіў праз нашу станцыю. Доўга чакалі адказу... А напрыканцы навучання ў школе аднекуль даведаліся, што ў Віцебску ёсць мастацка-графічнае педагагічнае вучылішча. З нашай вёскі мы паехалі паступаць у яго утрох: Ігнаценка, Абраменка і я. Але выехаць з калгаса было няпроста. Для гэтага спецыяльна было сабрана пасяджэнне праўлення калгаса. Праўда, адпусцілі ўсіх"[5].

[1] Інтэрв'ю з М.А. Апіокам. Запіс — ліпень 2025 г.
[2] Запіс перадачы "Время Art" ТРК "Віцебск" (21.01.2023).
[3] Запіс перадачы "Вечерний Витебск" ТРК "Віцебск" (11.01.2023).
[4] З інтэрв'ю з М.А. Апіокам. Запіс — студзень 2023 г.
[5] Запіс перадачы "Вечерний Витебск" ТРК "Віцебск" (11.01.2023).

Упершыню ў сваім жыцці на ўступным экзамене ў вучылішча М. Апіок маляваў нацюрморт. “Я першы раз пачуў гэта слова, яно мне было незразумела. І сёння памятаю гэты нацюрморт: гіпсавы куб, побач піраміда, а на кубе шар гіпсавы. Простыя геаметрычныя прадметы. Далі нам па аркушы паперы, па алоўку, гумку. І мы пачалі маляваць. А як гэта правільна рабіць, я не ведаў... На ўступных экзаменах я атрымаў усе чацвёркі, але да сённяшняга часу задаюся пытаннем: «За што?» Тым не менш паступілі ўсе трое. Наша паступленне было сапраўдным трыумфам у калгасе”[6].

З 1951 па 1955 г. Мікалай Апіок вучыўся ў Віцебскім мастацка-графічным педагагічным вучылішчы. “Вучоба ў вучылішчы — гэта было сапраўднае адкрыццё майго нутра. Першапачаткова адметную ролю адыграў В.К. Дзежыц. Добра памятаю першы летні пленэр, які ён праводзіў разам з намі на Дзвіне. Мы павінны былі маляваць дрэва — вялікую таполю. Валянцін Канстанцінавіч вучыў нас прастораваму ўспрыняццю аб’ектаў, уменню бачыць форму, аб’ём і перадаваць планавасць... А пасля ўрокаў мы — навучэнцы разам з Дзежыцам каталіся з заснежанай горкі...”[7].

У цэлым калектыў выкладчыкаў спецпрадметаў у Віцебскім мастацка-графічным педагагічным вучылішчы быў дастаткова моцным. Несумненна, як тады казалі, “свежую брую” ў выкладанне спецдысцыплін, у атмасферу творчасці, у майстэрскае жыццё вучылішча і горада ўнеслі маладыя выпускнікі Мінскага мастацкага вучылішча (зараз вучылішча імя А.К. Глебава В.Р. Шаталаў, М.Я. Лісоўскі і М.А. Назарчук, якія прыступілі да працы ў вучылішчы ў 1952 г. [4, с. 7]. “Мікалай Аляксандравіч Назарчук быў у нас класным кіраўніком і выкладаў усе спецпрадметы, у тым ліку жывапіс. Ён быў для нас сапраўдным класікам і, разам з тым, наватарам. Назарчук адкрыў для мяне жывапіс...”[8]

У 1956–1957 гг. Мікалай Апіок працягнуў навучанне на V курсе Мінскага мастацкага вучылішча. Пасля яго заканчэння некаторы час працаваў у Віцебску ў сістэме Мастацкага фонду БССР. “Ведаў усіх «класікаў» віцебскага мастацтва таго часу, з многімі працаваў разам на камбінаце «Мастацтва»”[9].

**Станаўленне творцы.** У 1959 годзе Мікалай Апіок паспяхова здаў экзамены на жывапіснае аддзяленне інстытута. “Я паступіў на жывапіс і два гады там адвучыўся. За нашай вучобай, як потым аказалася, сачыў вядомы тэатральны мастак Аскар Пятровіч Марыкс. Ён і прапанаваў мне і яшчэ двайм маім аднакурснікам заняцца сцэнаграфіяй і перайсці на спецыяльнасць «Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва»”[10].

У тэатральна-мастацкім інстытуце па жывапісе і малюнку М. Апіоку нейкі час давялося павучыцца ў розных педагогаў — В. Волкава, Ф. Бараноўскага, І. Стасевіча, А. Мазалёва, П. Масленікава. Але сваімі настаўнікамі ён у першую чаргу лічыць Ф. Дарашэвіча, В. Цвірко, А. Марыкса і Я. Чамадурава. “Яны ўбачылі ўва мне каларыста і навучылі мысліць у мастацтве” [3].

У 1964 годзе М. Апіок скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут. “Пасля заканчэння тагачасны рэктар інстытута П. Масленікаў настойліва прапаноўваў паступаць у аспірантуру. Другая прапанова паступіла ад Міністэрства культуры: пайсці да іх у аддзел выяўленчага мастацтва. Але я вырашыў, што я мастак і мне не патрэбная гэта канцылярская праца...”[11]

З 1964 г. па 1974 год працаваў мастаком-пастаноўшчыкам у Гродзенскім абласным драматычным тэатры, дзе аформіў больш за 30 спектакляў. Не пакідаў пры гэтым і займацца станковым жывапісам. У 1966 г. М. Апіок становіцца сябрам Саюза мастакоў, прымае актыўны ўдзел у мастацкіх выставах. У сярэдзіне 1970-х М. Апіок з сям’ёй пераязджае ў Мінск і пачынае працаваць на мастацкім камбінаце, але таксама супрацоўнічае з Нацыянальным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы.

У 2002 годзе Мікалаю Апіоку было прысвоена званне “Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь”. А праз некалькі гадоў ён стаў кіраўніком студыі ваенных мастакоў Цэнтральнага Дома афіцэраў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Студыя аб’яднала славутых майстроў жывапісу, сярод якіх былі ветэраны і дзеці вайны. “Сам час спрыяў стварэнню гэтага аб’яднання, галоўнай задачай якога стала стварэнне і папулярызацыя твораў на патрыятычную тэматыку”[12].

У 2007 г. М. Апіок ужо лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а ў 2011 г. — кавалер ордэна Францыска Скарыны. Гэтыя высокія ўзнагароды былі прысуджаны яму за значны асабісты ўклад у развіццё нацыянальнага выяўленчага мастацтва, актыўную дзейнасць па развіцці беларускай культуры і мастацтва, стварэнне

[6] Запіс передачы “Вечерний Витебск” ТРК “Віцебск” (11.01.2023).
[7] Тамсама.
[8] Тамсама.
[9] Запіс передачы “Время Art” ТРК “Віцебск” (21.01.2023).
[10] Запіс передачы “Дыялогі пра культуру” з М. Апіокам. Канал “Культура” Беларускага Радыё (06.05.2020).
[11] Тамсама.
[12] З інтэрв’ю з М.А. Апіокам. Запіс — студзень 2023 г.

высокамастацкіх жывапісных палотнаў, прысвечаных гісторыі і культуры Беларусі.

У 2017 годзе яму было прысвоена званне ганаровага члена Расійскай акадэміі мастацтваў за шматгадовую плённую дзейнасць і вялікі ўклад у развіццё мастацтва. Віншуючы Апіока з 90-гадовым юбілеем, Прэзідэнт Расійскай акадэміі мастацтваў В.З. Цэрэтэлі ў прывітальным слове адзначыў: "Асаблівую ўвагу ў творчасці Вы ўдзяляеце Айчыне, дзе ў якасці герояў выступаюць як выдатныя дзеячы беларускай гісторыі і культуры, імёны якіх назаўжды ўпісаны ў летапіс Беларусі, так і простыя працаўнікі. Акадэмія высока шануе Ваш унікальны талент, любоў да роднай зямлі і актыўную стваральную жыццёвую пазіцыю" [5].

Віцебшчына заўсёды прысутнічае і ў партрэтах, і ў краявідах М. Апіока. "А інакш і быць не можа. Гэта мая малая Радзіма..."[13] У 2018 годзе М. Апіоку прысвоена званне "Ганаровы грамадзянін Дубровенскага раёна".

**Партрэтны жанр у творчасці мастака.** Да жанру партрэта Апіок звяртаўся на працягу ўсяго творчага шляху. На думку многіх даследчыкаў, яго талент мастака менавіта ў партрэце праявіўся найбольш поўна і яскрава. "Партрэт — мой любімы жанр, — адзначае М. Апіок. — Я з вялікай асалодай на працягу ўсёй творчасці пісаў краявіды і нацюрморты, але пры гэтым разумеў: найвышэйшае мастацтва ёсць мастацтва партрэта"[14].

Партрэт паўстае ў мастака не проста як выява чалавека, але як дакумент эпохі, і як імкненне дакрануцца да значных гістарычных падзей, сведкамі якіх сталі яго героі. Тыпалогія партрэта ў палотнах М. Апіока вельмі шырокая: парадныя і камерныя партрэты, касцюміраваныя партрэты-карціны і партрэты-тыпы, гістарычныя і інтымныя партрэты. Мастак стварае як індывідуальныя, так і групавыя партрэты, але заўжды псіхалагічныя і эмацыянальна выразныя па сваёй сутнасці. Выбар таго ці іншага тыпу партрэта для мастака быў заўсёды адметным і непаўторным шляхам спасціжэння сваёй мадэлі, спосабам адлюстраваць унутраны свет асобы. Мікалай Апіок "малюе не толькі знешнія індывідуальныя рысы чалавека, але і раскрывае ўсё багацце і прыгажосць іх унутранага свету, іх душэўныя ўласцівасці"[6].

Надзвычай важным для стварэння высокамастацкага вобраза Мікалай Апіок заўжды лічыў працу з натуры. Высокая ступень падабенства выявы ў партрэце з мадэллю для Апіока — гэта не проста фармальная ўмова, а адно з ключавых пытанняў. У той жа час большасць партрэтаў — гэта не толькі імкненне дакладна перадаць знешнасць, але жаданне раскрыць характар чалавека, адлюстраваць вобраз неардынарнай асобы, у якой адчуваюцца прыкметы пэўнай эпохі. "Намаляваць проста знешне падобную выяву не складана. Для мяне важна выявіць сутнасць майго героя, перадаць яго псіхалагічны стан, яго тэмперамент, настрой, эмоцыі... Партрэт павінен загучаць знутры"[15].

Сярод ранніх партрэтаў мастака варта вызначыць "Партрэт Ганаровага будаўніка г. Мінска, камандзіра партызанскага атрада імя А.В. Суворава І.Д. Мікалаева" (1969), напісаны з вялізным тэмпераментам і з маладым запалам. Герой гэтага рамантычнага партрэта — яркая, энергічная асоба. Гэты вобраз блізкі да стылістыкі "суровага стылю", прадстаўнікі якога ўслаўлялі гераізм працоўных будняў, унутраную перакананасць, волю, самаахвярнасць і стойкасць людзей рабочых прафесій.

Значную групу сярод партрэтаў, што напісаны М. Апіокам у розныя гады, складаюць партрэты дзеячаў культуры і мастацтва. Сярод іх партрэты заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Тамары Іванаўны Апіок (1979), кампазітара Яўгена Глебава, народнага артыста СССР (2004), народнага артыста Рэспублікі Беларусь Генадзя Аўсяннікава, Міхаіла Пташука (2018–2021). Героі партрэтаў М. Апіока — людзі моцнага запалу, энергічныя, дзейныя, мэтанакіраваныя, валявыя, упэўненыя ў сабе, ініцыятыўныя, з высокім узроўнем творчай актыўнасці. Як і сам Апіок, многія з іх аптымістычныя асобы, носьбіты адкрытых, яркіх эмоцый. Гэтым абумоўлена падкрэсленая выразнасць і экспрэсіўнасць аўтарскай інтэрпрэтацыі мадэлі, выбар адпаведных сродкаў для яе трактоўкі. Адсюль смеласць ракурсаў, разнастайнасць пластычных рашэнняў, экспрэсіўная інтэнсіўнасць колеру і пэўная эцюднасць жывапіснай распрацоўкі.

У партрэтнай вобразнасці Апіока адчуваецца імкненне да ўзвышанай метафарычнай і сімвалічнай глыбіні вобраза. Дынамічныя схемы ў кампазіцыйнай структуры партрэтаў мастака пераважаюць над статычнымі. Вельмі важная роля належыць позам, жэстам, міміцы. Не менш значную ролю ў стварэнні вобраза адыгрываюць адзенне і іншыя атрыбуты.

Псіхалагічная глыбіня мастацкага вобраза, яго падкрэсленая эмацыянальнасць,

[13] Інтэрв'ю з М.А. Апіокам. Запіс — снежань 2022 г.
[14] Інтэрв'ю з М.А. Апіокам. Запіс — ліпень 2025 г.
[15] Інтэрв'ю з М.А. Апіокам. Запіс — ліпень 2025 г.

кампазіцыйная экстравагантнасць і складанасць жывапіснага рашэння, характэрныя для партрэтаў, якія напісаны М. Апіокам, у поўнай меры ўласцівы “Партрэту кампазітара, народнага артыста СССР Лучанка Ігара Міхайлавіча” (2015). Блізкі да яго па ступені пранікнення ў чароўны свет музыкі, у глыбіні музычнай творчасці “Партрэт народнага артыста БССР Уладзіміра Мулявіна” (2003–2004). “Уладзіміра Мулявіна я ведаў з 1966 года, калі яны былі яшчэ «Лявонамі» і прыехалі ў Гародню на гастролі. Я не аднойчы прапаноўваў напісаць яго партрэт. І вось аднойчы сустрэліся ў Палацы мастацтваў і ён спытаў мяне: «Калі»? Я пісаў партрэт з незвычайным захапленнем. І мне здаецца, ён атрымаўся, — жывы, свежы, рэальны”[16].

Неверагодна чуллівы і пранікнёны вобраз створаны М. Апіокам у “Партрэце народнай артысткі Беларусі, народнай артысткі СССР Станюты Стэфаніі Міхайлаўны” (2000). Уражвае выдатна перададзены мастаком высакародны характар артысткі, глыбокая чалавечнасць і душэўнасць, мудрасць і выключная сцэнічная харызма “каралевы беларускай сцэны”.

Мікалаем Апіокам створана велізарная галерэя партрэтных вобразаў беларускіх мастакоў (скульптара У. Церабуна (1989), заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Мікалая Назарчука (1991), мастака М.І. Ісаёнка (2003), народнага мастака Беларусі Івана Міско (2015), мастака М.І. Таранды (2010) і мастацтвазнаўцаў У. Вальфоўскага (1974), М. Цыбульскага (2025), Н. Шаранговіч (“Голас часу” (2020–2022).

Значнае месца ў творчасці М. Апіока займаюць касцюміраваныя (сцэнічныя) партрэты акцёраў, якія аб’яднаны адзіным цыклам “Акцёры і ролі”. У іх беларускія акцёры, нашы сучаснікі прадстаўлены ў вобразах гістарычных персанажаў. У творах М. Апіока касцюмізацыя выступае як спосаб фарміравання вобраза, ключом да прачытання якога становяцца касцюм, аксесуары, уласцівыя той ці іншай гістарычнай эпосе. Сярод іх партрэты: заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Уладзіміра Рагаўцова ў ролі Францыска Скарыны (1985), заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Аляксандра Дзянісава ў ролі Міколы Гусоўскага са спектакля А. Петрашкевіча “Напісанае застаецца” (1990), народнай артысткі Рэспублікі Беларусь Ліліі Давідовіч у ролі пані Боны (2001), народнага артыста Рэспублікі Беларусь Арнольда Памазана ў ролі пана Быкоўскага ў п’есе Я. Купалы “Паўлінка” (2010). Сцэнічныя партрэты Апіока заўсёды маюць нейкую “драматургію” і ў нечым становяцца падобнымі да спектакля. Дадзены тып партрэта дазваляе перадаць знешнасць і рысы мадэлі, яе вобраз, настрой, атмасферу пэўнай эпохі.

Ёсць у М. Апіока і некалькі двайных партрэтаў. На кожным з іх не толькі выразна раскрыты характары персанажаў, поўныя непаўторнай індывідуальнасці, але і змадэляваны маўклівы дыялог двух герояў партрэта. Сярод такіх твораў “Партрэт народнага артыста Беларусі Мікалая Кірычэнкі ў ролі Ягайлы і заслужанага артыста Беларусі Генадзя Давыдзькі ў ролі Вітаўта ў спектаклі «Князь Вітаўт» А. Дударава” (2003).

На другім двайным партрэце прадстаўлены сябры М. Апіока — мастакі Мікалай Назаранка і Леанід Шчамялёў. “Кожны вечар, у любую пару года, яны рабілі абавязковы шпацыр вакол дома на вуліцы Сурганава, дзе размешчаны майстэрні Беларускага саюза мастакоў. Так яны ўдваіх гулялі і бясконца гутарылі аб тым, што такое жывапіс” [7]. “Мне хацелася паказаць іх як носьбітаў тых высакародных нацыянальных рэалістычных традыцый, якімі звязана сучаснае мастацтва з мінулым”[17].

Асобна трэба сказаць пра групавы партрэт “Дзеячы беларускай культуры В. Раеўскі, Б. Герлаван, А. Дудараў” (1995). “Гэта святая тройца, боская тройца, якая зрабіла сапраўдныя шэдэўры ў галіне тэатральнага мастацтва...”[18] Шэраг спектакляў, якія былі пастаўлены імі на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы (“Радавыя”, “Парог”, “Вечар”, “Ядвіга”, “Князь Вітаўт”, “Чорная панна Нясвіжа” і інш.), адрозніваецца яскравасцю, навізной літаратурнай асновы і неардынарнасцю пастановачных рашэнняў. “Гэта пастаноўкі яркія і знакавыя, звязаныя з творчасцю выдатных майстроў беларускага тэатра — сцэнографа Б. Герлавана і рэжысёра В. Раеўскага. Трох названых творцаў аб’ядноўвае агульнае аўтарства і адзін погляд на канкрэтныя падзеі і асобы. Відавочна, што можна казаць пра самабытны тэатр драматурга, рэжысёра і мастака” [8, с. 121–126].

У галіне гістарычнага партрэта М. Апіокам створаны партрэтныя вобразы славутых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў: “Душа ляціць і ў небе тоне. А. Міцкевіч і М. Верашчака” (1998), “Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч” (1997), “Партрэт паэтэсы Я. Янішчыц” (1997)? “І думкі імкнуцца мімаволі (М. Багдановіч)” (2014) і інш. Дадзеныя партрэты перадаюць не толькі знешняе падабенства,

[16] Інтэрв’ю з М.А. Апіокам. Запіс — снежань 2022 г.

[17] Інтэрв’ю з М.А. Апіокам. Запіс — снежань 2022 г.

[18] Інтэрв’ю з М.А. Апіокам. Запіс — ліпень 2025 г.

індывідуальныя рысы герояў, але і светапогляд, глыбокі ўнутраны свет, сацыяльны статус, характар і атмасферу эпохі.

Сярод першых мемарыяльных партрэтаў М. Апіока, якія былі напісаны яшчэ ў сярэдзіне 1970-х і звязаны з падзеямі Вялікай Айчыннай, прыгадаем "Партрэт партызанкі Люды Сячко". З 1942 года Л. Сячко была членам падпольнай арганізацыі ў вёсцы Чарэшля Навагрудскага раёна, прабіралася ў нямецкія гарнізоны, збірала для партызан неабходныя звесткі, займалася распаўсюджваннем улётак. 22 сакавіка 1944 г. у час штурму фашысцкага гарнізона ў вёсцы Лугамавічы Іўеўскага раёна Л. Сячко атрымала смяротнае раненне пры ліквідацыі нямецкага дзота.

Мікалай Апіок многія гады сябраваў з М.А. Савіцкім. "Жаданне напісаць яго партрэт было заўсёды, але я нават не рашаўся яму прапаноўваць"[19]. Мікалай Апіок напісаў партрэт Героя Беларусі Міхаіла Савіцкага "Такі мой лёс. М.А. Савіцкі — народны мастак Беларусі" (2023–2024), сапраўднай легенды беларускага мастацтва, калі яго ўжо не стала.

Асобная старонка ў партрэтным жанры ў Мікалая Апіока — партрэты ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны (М. Асіпенкі, П. Галавачова, І. Мікалаева). "Цяпер я лічу першачарговай задачай захаваць як мага больш беларусаў, якія жылі, працавалі, ваявалі. Берагчы трэба сваё, бараніць..." [9]. Шэраг твораў па сваёй стылістыцы блізкія да жанра так званага параднага ваеннага партрэта. Але пры ўсёй блізкасці некаторых партрэтаў да парадных яны пазбаўлены празмернага пафасу ў прадстаўленні мадэлі.

Партрэты выдатных спартсменаў і касманаўтаў уражваюць цэльнасцю каларыстычнага выканання, тэмпераментным майстэрствам, лёгкасцю і артыстычнасцю жывапісу і дзіўнай свежасцю гучнага каларыту ("Партрэт Вольгі Корбут" (1975), "Партрэт Аляксандра Мядзведзя" (1989), "Партрэт Дар'і Домрачавай" (2014), "Рэпартаж з космасу. А. Навіцкі, Герой Расійскай Федэрацыі" (2022), "Касманаўты П.І. Клімук і У.В. Кавалёнак, двойчы Героі Савецкага Саюза" (2015).

Адмысловую групу складаюць лірычныя і камерныя партрэты. У першую чаргу гэта партрэты членаў сям'і мастака. Іх адметная рыса — эмацыянальнасць, інтымнасць, сканцэнтраванасць на ўнутраных перажываннях, душэўным стане, паэтычнасці вобраза.

Гэтыя партрэты адрозніваюцца ўнутранай статыкай выявы, эмацыянальнай стрыманасцю, натуральнасцю сітуацыі пазіравання ("Малады мастак" (1979), "Акно расчыненае. Наташа" (1987). Шэраг кампазіцый мастак прысвяціў сваёй маці (Трыпціх "Адзін дзень з жыцця Анастасіі Ягораўны" (1981), "Матуля. Анастасія Ягораўна" (1986).

Мноства аўтапартрэтаў, створаных М. Апіокам у розныя гады, уяўляе сабой унікальны візуальны летапіс яго жыцця, эвалюцыі творчай манеры і ўнутранага свету аўтара. У іх знайшлі адлюстраванне творчыя пошукі, спробы самапазнання і філасофскае асэнсаванне сябе (аўтапартрэты 1978, 1996, 2017 гг.).

**Вобразы і партрэтнасць тэматычных кампазіцый.** Тэматычныя карціны М. Апіока — гэта "згустак часу", выяўленага праз вобразы сучаснікаў і славутых гістарычных асоб. Адметнасць большасці тэматычных кампазіцый мастака — персаніфікаваная партрэтнасць вобразаў, якія ў іх прадстаўлены.

Шэраг кампазіцый, якія М. Апіок прысвяціў Вялікай Айчыннай, падкрэслена аўтабіяграфічныя. "Ваеннае ліхалецце немагчыма забыць..."[20] Успаміны, перажытае, прапушчаныя праз прызму мастацкага бачання, трансфармуюцца ў тыя ці іншыя сюжэты ("Купалле 1941 года", "Халоднае лета 41-га" (2019–2020), "Маё Хрышчэнне" (1994), "Божа, выратуй. Прысвячаецца жанчынам, што перажылі акупацыю" (2001–2015). У дачыненні да вышэйназваных твораў можна казаць аб аўтабіяграфізме як аб спецыфічнай мастацкай манеры аўтара. Напэўна, самы яскравы прыклад — кампазіцыя "Май, год 1945" (1991), дзе мастак адлюстраваў эпізод з са сваёй біяграфіі і намаляваў на палатне ўсю сваю сям'ю: бацьку, маці, старэйшую сястру і бабулю.

Блізкая да тэматычнага партрэта кампазіцыя "На Вашу думку, таварыш Жукаў" (2015). "Як я мог не напісаць партрэт Жукава, калі на працягу ўсёй вайны я чуў толькі гэтае імя! — адзначае М. Апіок. — Ужо пазней я прачытаў мемуары маршала і мне захацелася ў сваёй жывапіснай кампазіцыі ўскладніць характар гэтага вобраза"[21].

Цэнтральнымі героямі шэрагу тэматычных кампазіцый М. Апіока выступаюць знакавыя персанажы беларускай гісторыі і культуры. Палатно, прысвечанае Усяславу Чарадзею (2007–2025), — гэта даніна павагі яго асобе і "таму, што ён пакінуў пасля сябе — тэрытарыяльную цэласнасць і палітычную незалежнасць"[22]. Да таго ж "галоўная

[19] Інтэрв'ю з М.А. Апіокам. Запіс — ліпень 2025 г.

[20] Інтэрв'ю з М.А. Апіокам. Запіс — снежань 2022 г.

[21] Тамсама.

[22] Запіс перадачы "Дыялогі пра культуру" з М. Апіокам. Канал "Культура" Беларусскага Радыё (06.05.2020).

ідэя работы — яднанне славянскіх народаў. Невыпадкова ў цэнтры твора адлюстраваны тры Сафіі — Полацкая, Кіеўская і Наўгародская. Тут і вызначальныя асобы той эпохі — Усяслаў Чарадзей, Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі" [10].

Іранічны і разам з тым велічны вобраз Караля Станіслава Радзівіла па мянушцы "Пане Каханку", адной з найбагацейшых і ўплывовых асоб Вялікага Княства Літоўскага стварыў М. Апіок у кампазіцыі "Святочны выезд Радзівіла (Пане Каханку). Нясвіж 1769 г." (2005). Падзеі XII стагоддзя і вобраз Ефрасінні Полацкай, якая замовіла Лазару Богшу выраб напрастольнага крыжа з рэліквіямі, стаў асноўнай сюжэтнай падзеяй у палатне "Крыж Еўфрасінні Полацкай" (2015).

Па матывах паэзіі Максіма Багдановіча М. Апіок стварае шэраг жывапісных твораў, сярод якіх найбольш вядомае палатно "Слуцкія ткачыхі" (1983). "Даволі няпроста было атрымаць дазвол на знаёмства з арыгіналамі слуцкіх паясоў у Вільні. Да сённяшняга дня я памятаю, як у белых пальчатках я дакрануўся да гэтага шматвекавога сімвала гісторыі свайго народа..."[23]

Яшчэ адна частка твораў М. Апіока, дзе сустракаюцца персаніфікаваныя партрэтныя вобразы, прысвечана беларускай вёсцы, яе гісторыі і сучаснаму этапу. У іх таксама адчуваецца як аўтабіяграфічнасць мастацкага выказвання, так і імкненне канкрэтызаваць вобразы герояў "Калектывізацыя. 1929" (1976).

У кампазіцыях, якія прысвечаны сучаснаму перыяду, Узброеным Сілам Рэспублікі Беларусь, сённяшнім будням нашага войска, для М. Апіока таксама важна адлюстраваць герояў свайго часу. Так, цэнтральны матыў трыпціха "Шчыт Айчыны" (2005) звязаны з вайсковымі вучэннямі 2003 года. Немагчыма не заўважыць, што многія персанажы ў карціне пазнавальныя: галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі Рэспублікі Беларусь, міністр абароны, назіральнікі — замежныя аташэ... А ў кампазіцыі "Музы ў страі" таксама можна знайці партрэты канкрэтных асоб: І. Лучанка, мастака А. Савіцкага...

Мікалай Апіок знайшоў сваю жывапісна-пластычную манеру. У яе аснове традыцыі рэалістычнай школы жывапісу. "...бо без традыцый не будзе ні дзяржавы, ні сям'і, ні мастацтва", — запэўнівае Мікалай Апіок" [11]. Мастаку ўласціва аптымістычнае, мажорнае ўспрыманне навакольнага жыцця. Яго жывапіс пачуццёвы. "Апіок у сваіх творах акурат вольны мастак, ён піша раскавана, размашыста, нязмушана (...) Вымучанасць неяк не стасуецца з майстэрствам, якое вымагае лёту думкі і фантазіі, уяўлення" [12].

**Заключэнне.** Дадзены агляд партрэтных вобразаў не прэтэндуе на комплексную паўнату характарыстыкі творчасці М. Апіока, але канстатуе актуальнасць жанру партрэта ў яго творчасці і дае пэўнае ўяўленне пра вобразныя і тэхнічныя навацыі ў ім. Майстар стварыў цэлы шэраг выдатных твораў, якія вылучылі яго ў якасці аднаго з вядучых майстроў беларускага партрэта. Партрэтная галерэя мастака робіць уражанне свайго роду жывапісных "мемуараў". Лепш за ўсё шырокі дыяпазон творчасці Мікалая Апіока прадстаўлены зараз на яго персанальнай выставе "Шляхамі часу" ў Нацыянальным мастацкім музеі, якая адкрылася 27 лютага 2026 года да 90-гадовага юбілея мастака. У жывапісных творах гэтага творцы паўстае эпоха, прадстаўленая ў канкрэтных лёсах яе герояў. Мікалай Апіок перакананы — культура і мастацтва заўжды павінны быць на перадавой, павінны адгукацца на тое, што адбываецца ў краіне, грамадстве, павінны адлюстроўваць рэаліі сённяшняга дня.

[23] Інтэрв'ю з М.А. Апіокам. Запіс — ліпень 2025 г.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Купрэвіч, Н. Асоба і час Мікалая Апіока / Н. Купрэвіч // Краязнаўчая газета. — 2015. — № 46 (снеж.). — С. 6.
2. Берасцень, С. Угледзецца ў вобраз / С. Берасцень // Літаратура і мастацтва. — 2012. — 27 крас. — С. 19.
3. Климкович, С. Души полет и сердца вдохновение / С. Климкович // Армия. — 2008. — № 2. — С. 62–64.
4. Виноградов, В.Н. Витебское художественно-графическое педагогическое училище / В.Н. Виноградов, Е.Т. Жукова. — Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2005. — 47 с.
5. К 90-летию почетного зарубежного члена РАХ Николая Афанасьевича Опиока // Российская академия художеств. — URL: https://rah.ru/news/detail.php?ID=61864 (дата обращения: 15.01.2026).
6. Парфёнава, Н. Уступны артыкул да каталога / Н. Парфёнава // Мікола Апіок. Жывапіс = Nikolay Opiok. Painting. — Мн.: Беларускі саюз мастакоў, 1996. — 17 с.
7. Опиок, Н.А. Добрый художник / Николай Опиок; [беседовала] Ирина Овсепьян / И. Овсепьян // СБ. Беларусь сегодня. — 2021. — 10 февр. — С. 14.
8. Ярмалінская, В.М. Стварэнне прасторы аўтарскага тэатра на прыкладзе спектакляў па драматургіі А. Дударава ў рэжысуры В. Раеўскага і сцэнаграфіі Б. Герлавана / В.М. Ярмалінская // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 21 / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; навук. рэд. А.І. Лакотка. — Мн.: Права і эканоміка, 2016. — 354 с.
9. Корсакова, Е. Остаться в грядущих поколениях / Е. Корсакова // Дняпроўская праўда. — 2025. — 22 нояб. — С. 7.
10. Апіок, М.А. Вайна і мір Мікалая Апіока / М.А. Апіок; гутарыла В. Канюта // Звязда. — 2013. — 8 жн. — С. 3.
11. Mikheyev, V. Everything comes from the heart and soul / V. Mikheyev // Belarus. — 2022. — № 12. — С. 74–83.
12. Церабун, У. Ідзе вольна, а можа яшчэ і бегчы / У. Церабун // Мастацтва. — 2006. — № 1. — С. 20–21.


*Паступіў у рэдакцыю 23.02.2026*